Станкевіч А.А. (Гомель)

Моўныя сродкі стварэння выяўленчай выразнасці паэтычнага кантэксту Максіма Багдановіча

У лінгвістычнай літаратуры да гэтага часу няма адназначнага разумення паняццяў *экспрэсіўнасці, выразнасці* мастацкага маўлення. Тым не менш усе даследчыкі пагаджаюцца з думкай, што выразнасць – уласцівасць маўлення прыцягваць увагу слухачоў і чытачоў. Каб выклікаць і падтрымаць увагу адрасата, аўтару тэксту неабходна ўмець надаць выказванню нестандартную форму. У сувязі з гэтым выразнасць называюць асаблівай структурнай арганізацыяй, якая ўспрымаецца як незвычайнасць, адхіленне ад «нормы» і служыць сродкам выяўлення пачуццяў аўтара. «Экспрэсіўнае ў мове выступае як нерэгулярнае, нетыповае, і таму незвычайнае, свежае, выразнае» [3, с. 133].

Як і іншыя камунікатыўныя якасці, выразнасць ствараецца адзінкамі ўсіх узроўняў моўнай сістэмы і іх узаемадзеяннем – гукавым (спецыяльныя сродкі выяўленчай выразнасці гэтага ўзроўню – *асананс, аліт*[illegible]*я, рыфма*, *рытм*), лексічным (*экспрэсіўна-эмацыянальная лексіка, сінонімы, антонімы, наватворы*), лексіка-семантычным (*тропы*), словаўтваральным (*формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі*), сінтаксічным (*фігуры маўлення*). Пры гэтым неабходна ўлічваць, што ўсе ўзроўні моўнай сістэмы, якія ў немастацкім літаратурным маўленні адыгрываюць служебную ролю (выкарыстоўваюцца аўтаматычна), у паэтычным маўленні набываюць больш або менш важную самастойную значнасць, паколькі асноўная функцыя паэтычнай мовы – у максімальнай актуалізацыі моўнага выказвання.

Першаснай умовай выразнасці, па словах даследчыкаў, з'яўляецца мілагучнасць «як адпаведнасць гукавым стандартам літаратурнай мовы», другой умовай – нестандартнасць словаўжывання, навізна гукавой і рытмічнай арганізацыі тэксту, накіраваныя на фарміраванне і выяўленне яго сэнсу [2, с. 29]. У сувязі з гэтым асобныя даследчыкі вылучаюць фанетычную экспрэсіўнасць, якая ствараецца за кошт незвычайнай фанетычнай рэалізацыі слова, і сэнсавую экспрэсіўнасць, што дасягаецца ў выніку актуалізацыі незвычайнага семнага набору моўнай адзінкі.

Паэтычная творчасць М. Багдановіча з'яўляецца яскравым узорам максімальнай рэалізацыі выразнасці мастацкага маўлення як яго важнейшай камунікатыўнай якасці. Аўтар выкарыстоўвае практычна ўсе моўныя сродкі экспрэсівізацыі (узмацнення выразнасці) паэтычнага тэксту. Самым распаўсюджаным тыпам гукавога паўтору, які садзейнічае разнастайным прадметна-сэнсавым асацыяцыям, у вершах М. Багдановіча з'яўляецца алітарацыя – паўтарэнне зычных гукаў. Гэта тлумачыцца дамінуючым становішчам зычных у фанетычнай сістэме беларускай мовы. Алітарацыя свісцячых і шыпячых зычных стварае пэўныя асацыяцыі з гукамі прыроды (свіст, шоргат, скрып і да т.п.): *Шпарка коні імчацца ў полі, / Сумна бомы гудзяць пад дугой, / Запяваюць аб долі і волі, / Навяваюць у сэрцы спакой*; узмацняе псіхалагічны эфект перадачы пэўнага настрою – сумнага, мінорнага (*І снуюцца сумна ў сэрцы, / Ўюцца адгалоскі / Роднай песні, простай песні / Беларускай вёскі*) ці задумліва-элегічнага (*Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог. / Улажылі спаць мяне вы на зямлі*). Санорны плаўны **/л/** падкрэслівае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

плаўнасць, мяккасць гукаў, перадае лёгкі, павольны рух, навявае спакой і меланхолію*: Плакала лета, зямлю пакідаючы; Ціха ліліся слязінкі на поле*; дрыжачы **/р/** перадае выразныя або рэзкія гукі, грукат, гром і да т.п. : *Ударыў ён – і грукат пракаціўся; Мігае грозны меч, удары не сціхаюць; Здароў, марозны, звонкі вечар! / Здароў, скрыпучы, мяккі снег!*; губна-губны **/м/** стварае бадзёры, жыццярадасны настрой: *Мудрай прамовы / Мёд залацісты*.

Галосныя гукі, якія ў мове маюць меншую семантычную значнасць, у стылістычных мэтах выкарыстоўваюцца ў паэзіі радзей, хаця і з'яўляюцца асноўным фанетычным сродкам стварэння напеўнасці і меладычнасці вершаванага радка, яго інтанацыйна-гукавой выразнасці. У паэзіі М. Багдановіча часцей за ўсё асануюцца галосныя **/а/**: *Праясняецца пагода, / Бо вярнулася вясна. / Ўсё чакаеш, што прырода / Ўстрапянецца ада сна*; ***/і/***: *Ціхі вечар;знікнула спякота, / Весялей струіцца між чарота / Рэчка, што ўцякае ў ставок*; ***/ы/***: *Нашых дзедаў душылі абшары лясоў, / Не давалі ім жыці праўдзівым жыццём*; ***/у/***: *Удар, цыклон, удар на мора, / Цкуй яго ў глухое дно, / Ўсплясні ваду – і перлаў горы / На бераг выкіне яно*. Як паказваюць прыклады, гукавую экспрэсіўнасць немагчыма поўнасцю аддзяліць ад сэнсавай выразнасці.

Важнейшым спосабам экспрэсівізацыі паэтычнага тэксту М. Багдановіча з'яўляецца індывідуальна-аўтарскае словаўжыванне, якое непасрэдна звязана з выкарыстаннем самых актыўных сродкаў вобразнасці – тропаў і фігур. У сістэме іх выдзяляецца, у першую чаргу, метафара, якая надзвычай пашырана ў творчасці паэта. Найчасцей гэта персаніфікацыя, увасабленне: *Ноч плыве над зямлёй, сее росы, / Ноч шапоча русалкам:* «*Засніце*»; *За сцяной запявае завея*; *У поўначы астры ў саду расцвілі, / Убраліся ў росы, вянкі заплялі*. Некалькі радзей сустракаецца адухаўленне, прагапанея: *Сумна плыве маладзік бледна-сіні / Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд*; *Крэпка скутая снегам зямля*. Адметнасцю творчай манеры М. Багдановіча з'яўляецца стварэнне складаных, разгорнутых метафар, якія маюць надзвычай вялікую ступень выяўленчасці, ствараюць наглядны малюнак цэлай прыроднай з'явы: *Пала раса; у палёх / Загарэліся пацеркі мілых / Жоўта-чырвоных агнёў*; *Ўжо імгла над зямлёю лажыцца, / Чорнай рызай усё пакрывае, / Пылам зор небасхіл абсявае*; *І пад птушы крык і гоман, / Даўшы ўзалям вольны ход, / Прыпадыме бацька Нёман / На хрыбце магутны лёд*. Побач з дзеяслоўнай метафарай у вершах сустракаецца і субстантыўная, якая валодае не меншай экспрэсіўнасцю: *зор пасеў, зорак вянкі, пацеркі зор, хараводы зорак, зор грамада, павучына дажджа* і інш.

Па сваёй выяўленчай выразнасці і высокай ступені экспрэсіўнасці да метафары набліжаецца перыфраза – вобразнае апісанне прадмета, – што даволі часта выкарыстоўвае М. Багдановіч: *Брызгі золата ў небе блішчаць* = свецяць зоркі; *Вільготны месяц стуль на поле / Празрысты, светлы стоўп спусціў / І рызай срэбнаю раздолле / Снягоў сінеючых пакрыў* = асвяціў; *Навакол усё паветра / Ў струнах сонца залатых* = у промнях; *...сонца зайшло! / Ярка-чырвоныя, жоўтыя, бурыя / Боразны ў небе яно правяло* = пафарбавала неба; *Месяц пакрые палі палатном* = асвеціць.

У паэзіі М. Багдановіча прысутнічае і такі выразны трапеічны сродак, як параўнанне: *Свет спачывае, / Як шкло – ставок*; *Твар травой аблутаны, быццам павуцінай*; *Плач сэрца майго, як над горадам дождж*. Часта паэт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкарыстоўвае бяззлучнікавае параўнанне, якое, несумненна, валодае большай экспрэсіяй: *Заззяе серабром іголак / Зор грамада*; *Знічка коціцца агністаю слязой*; *Сэрца білася рыбкай у сеці тады*; *Вецер злосна ў хату рвецца*, / *Ў полі стогнам аддаецца*; *Гэта хмара – дыван-самалёт!*

Па-майстэрску карыстаецца М. Багдановіч сінанімічным паўторам, які прыводзіць да ампліфікацыі: *Не* ***паняць*** *таго ніколі, / Не* ***разведаць****, не* ***спазнаць****, / Не даюць мне думаць зыкі, / Што* ***ляцяць, дрыжаць, звіняць***; *Свечка* ***свеціць****, свечка* ***ззяе****, свечка* ***дагарае****, / Ой, не век жа свечцы тонкай* ***зіхацець, гарэці****, – /* ***Дагарыць*** *яна* ***і знікне****, як і ўсё на свеце*; *І* ***снуюцца*** *сумна ў сэрцы, /* ***Ўюцца*** *адгалоскі /* ***Роднай*** *песні,* ***простай*** *песні / Беларускай вёскі*; ***Змоўк*** *пясняр****, затаіў*** *свае песні, / Ён іх болей ужо* ***не пяе****.*

Да сінанімічнага паўтору па сваіх экспрэсіўных магчымасцях набліжаецца лексічны паўтор, які таксама садзейнічае эмацыянальнаму і лагічнаму выдзяленню паўтораных слоў: *Ад* ***родных*** *ніў, ад* ***роднай*** *хаты / У панскі двор дзеля красы / Яны, бяздольныя, узяты / Ткаць залатыя пояскі*; *На* ***глухіх*** *вулках – ноч* ***глухая****, / Не менш* ***глухі*** *людскі натоўп*; *І вось той гул мне ў душу ўліўся. /* ***Гудзі, гудзі****, дрыжачы дрот!* (у апошнім выпадку лексічны паўтор узмацняецца аднакаранёвым паўторам).

Такім чынам, экспрэсіўнасць як камунікатыўная якасць паэтычнага маўлення ствараецца на розных моўных узроўнях, якія ў сукупнасці і ўзаемасувязі ўтвараюць цэласную сістэму выяўленча-выразных сродкаў у творах М. Багдановіча.

Літаратура

1. Багдановіч, М. Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1968. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады.
2. Капацинская, Е.В. Определение выразительности и способы ее усиления / Е.В. Капацинская // Проблемы экспрессивной лингвистики ; отв. ред. Т.Г. Хазагеров. – Ростов н/Д., 1987. – С. 24–29.
3. Стернин, И.А. Семантическая основа экспрессивного словоупотребления / И.А. Стернин // Проблемы экспрессивной лингвистики ; отв. ред. Т.Г. Хазагеров. – Ростов н/Д., 1987. – С. 133–137.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ